тварэння ў капітал прыбыткаў, капіталізацыі даходаў. Дзякуючы К.к. удаецца рэалізаваць буйныя, перспектыўныя праекты з устойлівым прыбыткам. Асабліва моцны штуршок К.к. дало ў свой час развіццё такіх відаў вытв-сці, якія патрабуюць велізарных адначасовых затрат, матэрыяльных рэсурсаў і рабочай сілы (напр., буд-ва чыгункі). К.к. суправаджаецца павелічэннем памераў прадпрыемстваў і вядзе да стварэння манаполій і буйных капіталаў. Ва ўмовах сучаснай навукова-тэхн. рэвалюцыі выкарыстанне навукі ў вытв-сці і прыкладных даследаванняў вядзе да далейшага росту К.к. Найб. высокі ўзровень К.к. характэрны для такіх галін прамысловасці, як электронная, атамная, аўтамабільная, авіяцыйная, аэракасмічная і інш.

**КАНЦЭНТРА́ЦЫЯ НАПРУ́ЖАННЯЎ**, рэзкае павелічэнне *напружанняў механічных* у месцах змен формы цела (каля краёў адтулін, выступаў, драпін, зварных швоў, у вуглах і інш.). Зоны К. н. з'яўляюцца месцамі пачатку пластычнай *дэфармацыі* або разбурэння.

К. н. ацэньваюць каэф. К. н. — адносінамі мясц. найбольшых каля месца канцэнтрацыі напружанняў да намінальных. Унутраныя К. н. ўзнікаюць пры неаднароднай структуры матэрыялу, пры наяўнасці ў ім пор і шчылін. Найб. небяспечныя К. н. пры знакапераменных і ўдарных нагрузках, нізкіх т-рах. Змяншаюць або ліквідуюць К. н. разгружальнымі надрэзамі, умацаваннем краёў адтулін, выразаў і інш. слабых месцаў *наклёпам* (накаткай, тэрмахім. апрацоўкай і інш.). Вывучаецца К. н. *пругкасці тэорыяй*. *І.І.Леановіч.*

**КАНЦЭНТРЫ́ЧНЫ ПУЧО́К**, сасудзіста-валакністы цяж праводзячай тканкі раслін, у якім *драўніна* (ксілема) знаходзіцца ў цэнтры пучка, а *луб* (флаэма)— звонку ці наадварот. З'яўляецца закрытым пучком, бо адсутнічае камбій. Характэрны для вегетатыўных органаў папарацепадобных і аднадольных раслін. Гл. таксама *Калатэральны пучок.*

**КАНЦЭПТУАЛІ́ЗМ** (ад лац. conceptus думка, паняцце), 1) кірунак зах.-еўрап. сярэдневяковай схаластычнай філасофіі пра сутнасць агульных паняццяў (*універсалій*). К. займае прамежкавае становішча паміж сярэдневяковым рэалізмам і *намінализмам* у рашэнні праблемы рэалій. Паводле К., агульнае на ўзроўні аб'ектыўных рэчаў не існуе; няма такога быцця. Агульнае — гэта канцэпты, г. зн. ідэальныя (іматэрыяльныя) паняцці. Яны першапачаткова ўласцівы чалавечаму розуму і толькі ў ім існуюць. Яны апрыёрныя (дадоследныя) і з'яўляюцца формай пазнання, з дапамогай якой раскрываецца падабенства рэчаў. Найб. вядомыя прадстаўнікі К. П. Абеляр, У. Окам, Т. Гобс. У новы час ідэі К. пра прыроду паняццяў адстойвалі Дж. Лок, Э. Кандыльяк, К. Гельвецый. Паступова К. стаў адным з прынцыпаў тэорыі пазнання, паводле якога агульнае разглядаецца толькі як вынік абстракцыі. 2) У м а с т а ц т в е гл. ў арт. *Канцэптуальнае мастацтва.* *В.М.Пешкаў.*

**КАНЦЭПТУА́ЛЬНАЕ МАСТА́ЦТВА** (англ. conceptional art ад concept ідэя, агульная задума + art мастацтва), к а н ц э п т у а л і з м, кірунак у авангардным мастацтве 2-й пал. 20 ст. Узнікла ў ЗША ў канцы 1960-х г. (тэарэтык і аўтар тэрміна С. Ле Віт; мастакі Р. Бэры, Л. Вейнер, Д. Х'юблер, Дж. Косут), адначасова пашырылася ў Зах. Еўропе (мастакі англ. групы «Мастацтва і мова» Т. Аткінсан, Х. Харэл, Д. Байнбрыдж, М. Болдуін і інш.). Працягвае традыцыі *дадаізму* і антымастацтва. У аснове К. м. — ідэя (канцэпт) важнасці не самога суб'ектыўнага прадмета адлюстравання, якую дэклараваў *поп-арт*, а таго, што прадмет абазначае, адмаўленне абавязковай завершанасці маст. твора. Мастак-канцэптуаліст не столькі выканаўца твора, колькі яго праграміст, тэарэтык. Ён дае гледачу права на «сааўтарства», самаст. асэнсаванне магчымых варыянтаў разумення сутнасці твора, прапануе аналізаваць не твор, а прыроду, прызначэнне і сутнасць мастацтва. Аналіз кода твора ідзе праз філасофію і лінгвістыку. У якасці матэрыялу выкарыстоўваюць фотаздымкі, пісьмовую інфармацыю, графіку, гук, відэазапісы і інш., часам стварэнне маст. твора замяняецца рэфлекторнымі дыскусіямі. К. м. блізкае да *перфомансу*. *Я.Ф.Шунейка.*

**КАНЦЭ́ПЦЫЯ** ( ад лац. conceptio разуменне, сістэма), пэўны спосаб разумення, успрымання чаго-н.; трактоўка і асн. пункт погляду на прадмет, з'яву; вядучая канструктыўная лінія розных відаў дзейнасці (маст., тэхн., паліт. і інш.).

**КАНЦЭРАГЕ́НЫ** [ад лац. cancer рак + *...ген(ы)*], б л а с т а м а г е н ы, рэчывы або фізічныя агенты, здольныя выклікаць утварэнне злаякасных пухлін ці садзейнічаць іх узнікненню з нармальнай тканкі. Да К. адносяцца розныя хім. злучэнні (азотфарбавальнікі, араматычныя аміны, азбест, нітразаміны), фіз. фактары (рэнтгенаўскія прамені, ядзерныя выпрамяненні), некат. біял. агенты (анкагенныя вірусы, метабаліты трыптафану, стэроідныя гармоны). Канцэрагеннае ўздзеянне звязана з хім. актыўнасцю і электроннай будовай пэўнай ч. малекулы, якая ўтварае комплексы з некаторымі кампанентамі клеткі (нуклеінавыя кіслоты, бялкі). К. падзяляюць на 3 групы: мясцовага дзеяння, арганатропныя (выклікаюць пухліны ў пэўных органах), множнага дзеяння (выклікаюць розныя пухліны ў розных органах). Эфект залежыць ад дозы, працягласці ўплыву, стану рэактыўнасці арганізма, здольнасці тканак ці органаў назапашваць (дэпаніраваць) рэчыва. Новаўтварэнні ўзнікаюць праз $^1/_5$ — $^1/_7$ працягласці жыцця арганізма (у чалавека 15—20 гадоў, у мышэй 4—6 месяцаў). Многія К. маюць мутагенныя ўласцівасці (гл. *Мутагенез*). Папярэджанне ўздзеяння К. на арганізм заснавана на прадухіленні забруджвання паветра, вады, глебы прамысл. адходамі, недапушчэнні канцэрагенных прымесей у ежы і пітной вадзе, ажыццяўленні прафілакт. мер у галіне прафесіянальнай, камунальнай і асабістай гігіены.

*Літ.*: Н е й м а н И.М. Основы теоретической онкологии. М., 1961; К и с е л е в Л.Л. Онкобелки — продукты онкогенов. Тирозиновые протеинкиназы // Молекулярная биология. 1985. Т. 19, вып. 2.

**КАНЦЭ́РН** (англ. concern), форма аб'яднання юрыдычна незалежных прадпрыемстваў, якія вядуць сумесную інвестыцыйную, знешнеэканам. і фін. дзейнасць на аснове добраахвотнай цэнтралізацыі вытв., гасп., кіраўнічых функцый. К. — гэта не проста саюз, заснаваны на дагаворы, а форма рэальнай інтэграцыі. К. могуць быць галіновыя і шматгаліновыя.

Першыя К. ўзніклі ў Германіі і набылі пашырэнне ў пач. 1920-х г. Спачатку яны аб'ядноўвалі прадпрыемствы з аднолькавым вытв. працэсам, пазней — прадпрыемствы living рознага профілю, звязаныя паміж сабой нефармальнымі сувязямі, заснаваны гал. чынам на фін. кантролі.

У Беларусі К. лічацца аб'яднанні прадпрыемстваў, якія здзяйсняюць асобныя вытв. і інш. гасп. функцыі, а таксама асобныя функцыі кіравання. Пры ўваходжанні ў К. дзярж. прадпрыемствы страчваюць сваю ведамасную прыналежнасць. Яны могуць уваходзіць толькі ў адзін К. і ў сваёй фірменнай назве абавязаны пазначаць прыналежнасць да яго. К. можа ствараць гасп. разліковыя арг-цыі па аказанні камерцыйных, праектна-канструктарскіх, буд., тэхнал., юрыд. і інш. паслуг. У наш час у Беларусі адбываецца рэарганізацыя асобных галіновых міністэрстваў у дзярж. К., падпарадкаваныя непасрэдна Ураду Рэспублікі Беларусь. Прадпрыемствы і арг-цыі, якія ўваходзяць у К., захоўваюць самастойнасць і правы юрыд. асобы. Сваю дзейнасць яны ажыццяўляюць у адпаведнасці з законам «Аб прадпрыемствах у Рэспубліцы Беларусь» і інш. заканад. актамі. На 1.1.1998 у Беларусі існуе 15 дзярж. К. *А.Б.Дорына.*

**КАНЦЭ́РТ** (італьян. concerto канцэрт, гармонія, згода ад лац. concerto спаборнічаю), 1) музычны твор, заснаваны на кантрастным гучанні поўнага выканальніцкага складу і асобных груп ці сола або кантраст розных груп інструментаў, вакальнага ці вак.-інструментальнага складу. Вядомы з 16 ст. як мнагахорны К. («Concerti» А. і Дж.Габрыэлі). Харавы К. а cappella як асн. жанр *партэсных спеваў* быў пашыраны ў праваслаўнай царк. музыцы спачатку на Беларусі і Украіне, з 17 ст. і ў Расіі ( В. Ціто́ў, М. Беразоўскі, Дз. Бартнянскі). Гіст. разнавіднасці інстр. К.: *канчэрта гроса*, класічны сольны інстр. К. у санатнацыклічнай форме для 1, радзей 2, 3 ( т. зв. двайны і трайны К.) саліста́ў з аркестрам (І. Гайдн, В.А.Моцарт, Л. Бетховен) і рамантычны 1-частквы К. паэмнага тыпу (Ф. Ліст). Узоры К. стварылі таксама П. Чайкоўскі, С. Рахманінаў, А. Глазуноў, С. Пракоф'еў, Дз. Шастаковіч, А. Хачатуран і інш.